палітычныя сродкі для захаплення ўлады, лічыць Абдзіраловіч, мала што можа даць для, «забесьпячэння грамадскае самадзейнасці і можа выклікаць новую роспач і нездаваленьне» [1, с. 35]. «Бо калі сілай знішчыць існуючы парадак, дык нятворчасць сучаснай чалавечай масы створыць сабе назаўтра яшчэ горшыя кайданы, турмы і мукі» [1, с. 42].

Адзіным праўдзівым кірункам, на думку аўтара, з'яўляецца кааперацыя, гэта такая грамадская з'ява, якая непрымусова аб'ядноўвае сяброў, не дэкларуючы прымусу для іншых, з яе дапамогай чалавечая душа пойдзе ўласным шляхам да Боскай творчасці. Галоўнае жаданне чалавека – быць вольным і самастойна тварыць сваё жыццё, але стаць адразу такім не атрымаецца, таму што на працягу стагоддзяў прымус старанна выконваў сваю справу дэмаралізацыі. Каб знайшлі свой выраз як творчасць асобы, так і грамадства, неабходна адсутнасць прымусу ва ўсіх сферах сацыяльнага жыцця. Але масава творчая адзінка з'явіцца не адразу, усе формы прымусовага існавання паступова зруйнуюцца чалавечай творчасцю. Прабуджаныя да творчасці народныя масы, кіруючыся прысутнасцю ў сваёй душы творчай Міравой душы, на шляху кааперацыі змогуць своечасова руйнаваць аджыўшыя формы жыцця і ўсталёўваць новыя, адпаведныя такому стану рэчаў, за якім будучыня.

**Літаратура і крыніцы**

1. Абдзіраловіч, І. Адвечным шляхам. Даследзіны беларускага сьветагляду / Ігнат Абдзіраловіч. – Мінск: Навука і тэхніка, 1993. – 44 с.

## АБ ВЫТОКАХ ДУХОЎНАСЦІ І ГАРМОНІІ Ў ГРАМАДСТВЕ. ПРЫСВЯЧЭННЕ МІКАЛАЮ ІГНАТАВІЧУ КРУКОЎСКАМУ (1923–2013)

*Васіль Якавенка*

Думка напісаць гэты артыкул узнікла ў мяне падчас навуковай канферэнцыі «Доўгірдаўскія чытанні – IV», праведзенай у маі 2013 года Інстытутам філасофіі НАН Беларусі, дзе я выступаў са спецыяльным дакладам пра жыцце і навуковую дзейнасць М. І. Крукоўскага. І вось цяпер сачыняю, адштурхоўваючыся ад навуковых прац М. Крукоўскага, Л. Яўменава, В. Пазнякова, А. Рагулі, К. Хюбнера, К. Ясперса, Э. Сміта, В. Гумбальта, К. Лявонцьева, а таксама сваіх ранейшых артыкулаў і разважанняў.

У маім жыцці было два філосафы, якіх я без асаблівага напружання мог зразумець, якім я аддаваў перавагу і асабліва цаніў, – гэта немец Вільгельм Гумбальдт і беларус Мікола Крукоўскі, гуманісты розных эпох, далекія адзін ад аднаго і, тым не менш, блізкія мне, бо адказвалі на мае запыты да навукі. У першым вучоным захапляла глыбокае веданне лінгвістыкі, разгляд яе ў дынаміцы, у сацыяльным, культуралагічным і філасофскім плане, даступнасць мовы. Гумбальдт разумеў мову народа не як нешта аднойчы злепленае і застылае, а як бесперапынны працэс духоўнай творчасці, «фарміруючы орган думкі», без якога ў народа няма ўласна свайго светаўспрымання, якое вызначае і ўсе астатнія духоўныя адносіны чалавека да

рэчаіснасці. Вышэйшы духоўны ідэал вучоны бачыць у абуджэнні цэласнага душэўнага свету ў адзінстве яго творчых здольнасцей. Гармонія ж – у паўнаце раскрыцця фізічных і духоўных сіл кожнага.

Як можна меркаваць хоць бы па гэтым, Гумбальдт усутык падыходзіць да закона *развіцця* ўсяго жывога і існага, у тым ліку сацыяльных структур, – да універсальнага, зазначым, закона, адкрытага Канстанцінам Лявонцьевым: развіцце ідзе ад простага да складанага, ад аднастайнасці да шматаблічча, ад шэрага да квяцістага, а вось гармонія развіцця — у *адзінстве разнастайнасці*, да прыкладу, моў і культур. Без разнастайнасці свет блякне, у ім набывае свае прыярытэты шэрасць, спакваля ідзе распад і гібель таго, што ў суквецці радавала.

Да Міколы Крукоўскага гэтыя ісціны дойдуць як бы самі сабой. З кніжных крыніц ён, дарэчы, таксама пачэрпне нямала. Адно няможна з пэўнасцю сказаць: што больш: кнігі ці жыццё чалавечае – зрабілі яго філосафам, такім менавіта, якім склаўся.

Мікалай Ігнатавіч Крукоўскі, перш чым стаць філосафам, багата чаго зведаў у жыцці. Яшчэ будучы маладым чырвонаармейцам, патрапіў у нямецкі палон, збег адтуль і, прыхапіўшы томік Гегеля ў заплечнік, рушыў у партызанскі атрад, які дзейнічаў пад Оршай. Быў паранены.Томік Гегеля, папаўшы пад руку, няйначай, быў падараваны яму самім лесам, пра што ніхто тады не гаварыла, аднак ен, той томік, аказаўся знакавым, бо ў сталыя гады Мікола Ігнатавіч акурат і вернецца да Гегеля, да філасофіі, будзе даследаваць і развіваць шчыра, кампетэнтна і пленна далей гегелеўскую эстэтыку.

Уражвае разнастайнасць інтарэсаў, заняткаў, захапленняў, з якімі Мікола Ігнатавіч ішоў па жыцці. Яшчэ будучы юнаком марыў стаць музыкай і па-заліхвацку іграў на мандаліне, а стаўшы пасляваенным студэнтам БГУ, спяваў у хоры Вялікага тэатра оперы і балета (разам з жонкай), любіў праводзіць летні адпачынак у вандроўках на яхце па рэках і азерах роднай Беларусі (выпраўляўся ў вандроўкі зазвычай разам з жонкай і дзецьмі), з ахвотай хадзіў на лыжах і займаўся плаваннем. Апроч яхты займеў свой тэлескоп і нярэдка ўзіраўся ў зорнае неба. Упрыгожваў сцены сваей кватэры уласнымі малюнкамі, пачынаў з нацюрмортаў. Ужо ў рангу прафесара выкладаў ва універсітэце філасофію на роднай беларускай мове, хоць у тых палітычных варунках жыцця гэта не ўхвалялася і пагражала яму звальненнем з працы.

Вось у такой іпастасі патрыёта сваей зямлі і Айчыны, чалавека, які жыў паўнацэнным і цікавым жыццём, дыхаў грудзьмі напоўніцу, меў лагодны і адначасова ўпарцісты характар, рашуча адстойваў сваю лінію, пазіцыю ў любых умовах, у такой іпастасі ён і паўстае перад намі як даследчык прадмета філасофіі, пранікнены, глыбокі аналітык. Карціць зазначыць, што не выпадкова яму было наканавана стаць гаспадаром у пакінутым Гегелем хораме эстэтыкі і заняцца там вывучэннем і ўладкаваннем сістэм, метадалогіяй – логікай эстэтычнага, да прыкладу, вызначэннем эстэтычных катэгорый, і паняццяў. Ягоная першая буйная манаграфія «Логіка прыгажосці», напоўненая глыбокім, яскравым, шматпланавым зместам, напісаная добраю моваю, даступнаю для простага чытача, адразу ж паставіла аўтара ў лік вядомых у навуковым свеце філосафаў. Далейшыя манаграфічныя працы «Эстэтычныя катэгоры і», «Кібернетыка і законы прыгажосці», «Чалавек прыгожы»,

«Філасофія культуры», «Бляск і трагедыя ідэала» толькі пацвердзілі і ўмацавалі думку пра Мікалая Ігнатавіча як пра неардынарнага і таленавітага беларускага мысляра, маючага самастойную і неацэнную для навукі парадыгму мыслення.

На самай справе, абапіраючыся на сусветную спадчыну і перш за ўсе на вяршыню нямецкай класічнай філасофіі – працы Гегеля і некаторых яго паслядоўнікаў, Крукоўскі спалучыў гегелеўскі панящщевы апарат з тэорыяй сістэм і сістэмнай генетыкай, кібернетыкай семіотыкай і іншымі галінамі. Атрыманая ў выніку такога спалучэння і асэнсавання сістэм канцэпцыя аўтара не мае падабенства ў свеце. Гэтым самым яшчэ раз даказаны як прадуктыўнасць дыялектыкі і эстэтыкі Гегеля, так і навуковы чынны досціп нашага філосафа. Па меркаванні ягоных калег, нельга не адзначыць арыгінальную методыку аўтара і асабліва, як ён ёю памайстэрску карыстаецца пры аналізе дынамікі развіцця грамадства і яго культуры. Мікалай Крукоўскі урэшце выйшаў на канцэпцыю адзінства ідэальнага і матэрыяльнага — халізм і на гэтай аснове паказаў паўнату і цэласнасць свету, чаго край не хапае чалавеку ў сучасную эпоху з яго захапленнем матэрыяльнымі дабротамі і фізічным прагным спалучэннем з асобамі, падобнымі да сябе і непадобнымі, як жывелы. Згадваецца, з якім задавальненнем і асабістай годнасцю Мікалай Ігнатавіч падпісваў «Ліст у Еўропу», складзены намі з выпадку дэградацыі еўрапейскай супольнасці (ён, гэты ліст не страціў і зараз сваёй актуальнасці).

Пра значэнне і веліч постаці вучонага Крукоўскага неўзабаве засведчылі і некаторыя расійскія філасофы, першы раз было, калі ен у Маскве трыумфальна абараняў доктарскую дысертацыю, у другі раз – калі мы звярнуліся да расійскіх мысляроў з прапановай падрыхтаваць і выдаць творы Мікалая Ігнатавіча ў 5 тамах, – яны з задавальненнем увайшлі ў міжнацыянальны рэдакцыйны савет па падрыхтоўцы да друку спадчыны М. І. Крукоўчкага. Такое выданне запланавана ў Расіі на 2015 год, працу (праект) выконвае грамадзянская ініцыятыва «Інстытут нацыянальнай памяці». Дадам, што з беларускага боку ў рэдакцыйны савет увайшлі філосафы Леанід Яўменаў, Эдуард Сарока, Аляксандр Лапцёнак, Аляксей Рагуля, пісьменнік Анатоль Астапенка і інш. Практычна мы выпускаем поўны збор твораў шаноўнага мысляра.

## *3.4 Феномен научной школы в развитии интеллектуальной культуры Беларуси и России*

# ИНСТИТУЦИОНАЛЬНАЯ ОСНОВА БЕЛОРУССКОЙ НАУКИ В ВИДЕ ИССЛЕДОВАТЕЛЬСКИХ ШКОЛ

*А. И. Лойко*

Функционирование науки связано с деятельностьюисследовательских школ. Обоснованным является подход к рассмотрению школы как исторически обусловленной формы организации научной деятельности группы исследователей,